# ВОДЗЫЎ

аб кандыдацкай дысертацыі Дзігадзюк Валянціны Паўлаўны «Катэгорыі праспекцыі і рэтраспекцыі ў мастацкай прозе У. Гніламёдава», прадстаўленай на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова

Катэгорыі праспекцыі і рэтраспекцыі вывучаліся ў мовазнаўстве на працягу значнага перыяду. Іх кваліфікацыя, класіфікацыя і сістэматызацыя праводзілася з улікам тэарэтычных асноў і метадалагічных прынцыпаў лінгвістычных школ і напрамкаў, у межах якіх праводзілася даследаванне. У беларускім мовазнаўстве амаль адсутнічае вывучэнне часавых форм дыскантынуума, таму прадстаўленая дысертацыя з'яўляецца першым вопытам апісання рэпрэзентатыўнага дыяпазону катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі ў мастацкіх творах. Таму праблематыка даследавання з'яўляецца новай, сучаснай і запатрабаванай.

Высновы, палажэнні і рэкамендацыі, якія змяшчаюцца ў дысертацыйным даследаванні В.П. Дзігадзюк «Катэгорыі праспекцыі і рэтраспекцыі ў мастацкай прозе У. Гніламёдава» з'яўляюцца абгрунтаванымі і аргументаванымі, што тлумачыцца разнастайнасцю метадаў даследавання, іх удалым спалучэннем, дастатковай колькасцю крыніц даследавання (7 пазіцый), дакладным аналізам значнай колькасці фактычнага матэрыялу (каля 1463 праспектыўных і рэтраспектыўных тэкставых блокаў), значнай колькасцю апрацаваных навуковых крыніц як айчынных, так і замежных аўтараў (на англійскай, нямецкай мовах), спіс літаратуры ўключае 198 пазіцый.

Дысертацыя з'яўляецца першай айчыннай работай, якая ўяўляе сабой комплекснае і шматбаковае даследаванне катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі ў беларускай мастацкай прозе. Арыгінальным з'яўляецца вызначэнне рэтраспектыўных і праспектыўных адзінак у творах У. Гніламёдава метадам суцэльнай выбаркі. Прапанавана аўтарская таксаномія для класіфікацыі названых кампанентаў, якая ўлічвае як паўнату выражэння граматычных катэгорый, так і функцыянальна-семантычныя характарыстыкі такіх адзінак.

Акрамя таго, новым з'яўляецца і матэрыял даследавання – гэта мастацкая проза У. Гніламёдава, што дапамагае выявіць асаблівасці рэпрэзентацыі праспекцыі і рэтраспекцыі ў ёй.

Навуковая значнасць вынікаў даследавання Дзігадзюк Валянціны Паўлаўны заключаецца ў распрацоўцы крытэрый аналізу, універсальных і спецыфічных параметраў тыпалогіі і прынцыпаў класіфікацыі тэкставых катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі, у распрацоўцы сістэмы комплекснага аналізу рэпрэзентацыі катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі ў беларускай мове, якая можа быць выкарыстана для аналізу іншых катэгорый і іх сродкаў моўнага выражэння – мадальнасці, лакатыўнасці, кагезіі і інш.

Асноўныя палажэнні і вынікі даследавання абмяркоўваліся на пасяджэнні кафедры рускага і беларускага мовазнаўства МДПУ імя І.П. Шамякіна, а таксама на рэспубліканскіх і міжнародных навуковых канферэнцыях.

Асноўныя вынікі дысертацыйнага даследавання адлюстраваны ў 14 публікацыях, з якіх 7 – у рэцэнзаваных выданнях, рэкамендаваных ВАК Рэспублікі Беларусь, 3 – у зборніках навуковых артыкулаў, 4 – у зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый.

У адпаведнасці з п. 19, 20 Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў навуковую ступень кандыдата філалагічных навук саіскальніку В.П. Дзігадзюк варта прысудзіць за:

– распрацоўку і сістэматызацыю параметраў тыпалогіі катэгорый праспекцыі і рэтраспекцыі – сюжэтна-кампазіцыйныя асаблівасці мастацкай прозы, магчымасць моўнай рэпрэзентацыі і структурна-сэнсавай дыферэнцыяцыі названых катэгорый, што вызначае тыпа- і відаўтварэнне названых катэгорый;

– выяўленне тыпаў праспекцыі ў творах У. Гніламёдава – кампазіцыйна-тэкставы і сюжэтна-кампазіцыйны, вызначэнне логіка-семантычных адносін паміж праспектыўнымі кампанентамі – тоеснасці, уключэння, перасячэння, неадпаведнасці, мадальна-сэнсавых і камунікатыўных маркераў, структурнай арганізацыі праспектыўных кампанентаў;

– вызначэнне і класіфікацыю тыпаў рэтраспекцыі ў прозе У. Гніламёдава – адсылачны, кампазіцыйна-тэкставы, тэкставы сюжэтны, відаў – кантактны і дыстантны, класа рэтраспектыўных адносін – тоеснасці, уключэння, лексіка-граматычных маркераў катэгорыі, устанаўленне яе структурных рэпрэзентатыўных тыпаў – складаных сказаў, канструкцый з сінтаксічнай непаўнатой і імпліцытнай семантыкай, рэдукаваных, эліптычных, далучальных і ўстаўных канструкцый;

– устанаўленне відаў кампазіцыйна-тэкставай рэтрапекцыі – пазатэкставай і фактычнай, прыёмаў яе рэалізцыі – намінацыі рэтраспектыўных падзей, іх інфармацыйнае дапаўненне, супастаўленне і параўнанне, прыём прамой актуалізацыі мінулых падзей, моўнай і структурнай арганізацыі кампазіцыйна-тэкставай і тэкставай сюжэтнай рэтраспекцыі.

Навуковы кіраўнік –
доктар філалагічных навук,
прафесар, прафесар кафедры
мовазнаўства і лінгвадыдактыкі
ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны
педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка» Н.У. Чайка

Подпіс Чайкі Н.У.
сведчу намеснік начальніка АК БДПУ
10.05.2023